# Напярэдні. Эскіз вобразу.

Калі вы чытаеце творы поэта, нават і такога, якога і ў вочы ня бачылі, у вас, пэўна–ж, ва ўяўленьні складваецца яго вобраз, вы яго ўяўляеце сабе ў пэўнай адчувальнай постаці, у пэўным вобразе. І ў вас ёсьць шмат такіх вобразаў. У вас, пэўна–ж, калі вы чыталі творы П[ушчы], стварыўся і яго вобраз. І што гэта так, аб гэтым кажуць дакумэнты, якія выдрука[ва]н[ы] у выглядзе рэцэнзій, нататак і г. д. Для адных ён уяўляецца кулак[ом], для другіх — буянам, для трэціх — нейкім страшыдлам. І кожны стараўся ў залежнасьці ад таго вобразу, у якім ён яму зьявіўся, так ці іначай рэагаваць. Адны казалі: гэта вораг, трэба з ім змагацца, другія казалі: гэта мяртвечына, выкіньце яго з свае галавы і г. д. І выяўлялі сваё азлабленьне, спаганялі злосьць на поэце…

У мяне ёсьць свой вобраз поэты. Вось гэты вобраз я і хачу нарысаваць перад вамі ці, праўдзівей, апісаць яго ў яго контурах. Перш за ўсё ўяўляецца мне гэты вобраз у постаці коласаўскага С[ымона] М[узыкі], які жыве толькі ня ў творы, а ў рэальным жыцці і талент якога ня гра на скрыпцы, а маляўніцтва, художніцтва, жывапісаньне музыкаю слоў. Гэта С[ымон] М[узыка], пайшоўшы пясьнярскаю каляінаю сьвядома. Я. Колас расказаў пра С[ымона] М[узыку], пра яго песьні, расказаў яго гісторыю, падаў канкрэтныя прыклады з яго жыцьця. С[ымон] М[узыка] у Коласа ня сам гаворыць за сябе, за яго і пра яго гаворыць аўтар. Пушча–ж — гэта С[ымон] М[узыка], які сам за сябе гаворыць, які сам расказвае, што ён перажыў і што перажывае, сам расказвае, як уяўляецца яму сьвет і жыцьцё, сам гаворыць, што і хто ён ёсьць. Колас расказаў пра яго. У постаці–ж П[ушчы] С[ымон] М[узыка] зьявіўся перад намі сам з сваімі песьнямі. П[ушча] — гэта С[ымон] М[узыка] у горадзе ў рэволюцыйны час.

Калі пра С[ымона] М[узыку] Кол[ас] казаў:

> У яго быў сьвет цікавы,
> Свае вобразы, жыцьцё,
> І ў душы ў яго ўсе зьявы
> Сваё мелі адбіцьцё,

то С[ымон] М[узыка] — П[ушча] сам ужо каж[а]:

> Хоць я вырас, як сын той сабачы,
> Ўсё–ж жыве у грудзёх сакалінае слова.

*[1927]*